33. Постановление СНК СССР и ЦК ВКП(б) от 31.05.1935 о ликвидации детской беспризорности и безнадзорности [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://https://ru.wikisource.org/wiki/htm. – Дата доступа: 12.12.2021.

34. Примаченок, А. А. Проблемы борьбы с преступностью несовершеннолетних / А. А. Примаченок ; науч. ред. П. В. Дудковский. – Минск : Наука и техника, 1980. – 240 с.

35. Тимофеев, В. Г. Уголовно-исполнительная система России: цифры, факты и события / В. Г. Тимофеев. – Чебоксары, 1999. – 206 с.

Дата поступления в редакцию: 29.03.2022

УДК 93/94

***І. А. Мамайка***, *дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь*
*e-mail: Mamaiko@house.gov.by*

## АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ ДЗЕЙНАСЦІ МІЛІЦЫІ БЕЛАРУСІ Ў 1917–1934 гг.

*На падставе шырокага кола крыніц разглядаюцца асноўныя напрамкі дзейнасці рабоча-сялянскай міліцыі на тэрыторыі Беларусі ў 1917–1934 гг. Вызначана, што дзейнасць міліцыі Беларусі ў 1917–1934 гг. была падпарадкавана агульным задачам сацыялістычнага будаўніцтва, а фарміраванне штатнай цэнтралізаванай структуры беларускай міліцыі пачалося з 1921 г.*

*Ключавыя словы: рабоча-сялянская міліцыя, Народны камісарыят унутраных спраў, Савецкая Беларусь.*

***I. A. Mamaiko***, *Deputy of the House of Representatives of the National Assembly of the Republic of Belarus*
*e-mail: Mamaiko@house.gov.by*

## THE MAIN ACTIVITY AREAS OF THE MILITIA OF BELARUS IN 1919–1934

*Based on a wide range of sources, the main areas of activity of the workers'-and-peasants' militia on the territory of Belarus in 1917–1934 are considered. It is determined that the activity of the militia of Belarus in 1917–1934 had the general tasks of socialist construction and the formation of a regular centralized structure of the Belarusian militia began in 1921.*

*Keywords: workers'-and-peasants' militia, People's Commissariat of Internal Affairs, Soviet Belarus.*

Працэс станаўлення і дзейнасці міліцыі як дзяржаўнага органа, на які ўскладаліся функцыі падтрымання правапарадку і аховы грамадскай бяспекі, на тэрыторыі Беларусі пачаўся пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г.

Ужо на працягу першых тыдняў рэвалюцыі адбыліся грунтоўныя змены ў сістэме Міністэрства ўнутраных спраў (МУС) Расійскай імперыі: 3 сакавіка Часовы ўрад абвясціў «замену полиции народной милицией с выборным начальством, подчиненным органам местного самоуправления», замест Дэпартамента паліцыі ў складзе МУС створана Часовае ўпраўленне па справах грамадскай паліцыі і забеспячэнні асабістай і маёмаснай бяспекі грамадзян (15 чэрвеня 1917 г. перайменавана ў Галоўнае ўпраўленне па справах міліцыі і па забеспячэнні асабістай і маёмаснай бяспекі грамадзян [22, с. 58]).

Прававой асновай арганізацыі і дзейнасці народнай міліцыі з'явіліся пастанова «Об учреждении милиции» и «Временное положение о милиции», выдадзеныя 17 красавіка 1917 г. Паводле «Временного положения о милиции» яна азначалася як «исполнительный орган государственной власти на местах, состоящий в непосредственном ведении земских и городских общественных самоуправлений» [23, с. 186], а яе асноўная функцыя была сфармулявана ў арт. 18 згаданага дакумента: «Милиция охраняет общественную безопасность и порядок и защищает всех и каждого от всякого насилия, обид и самоуправства» [23, с. 188].

Агульнае кіраўніцтва міліцыяй у межах усёй краіны належала міністру ўнутраных спраў, а ў межах губерні – непасрэдна ўскладалася на губернскага камісара, які з'яўляўся «представителем Временного правительства в губернии, осуществляющим надзор за точным и повсеместным в губернии соблюдением законов, постановлений и распоряжений Правительства местными органами управления и самоуправления» [25].

Пасады губернскага і павятовага камісараў былі заснаваны ў сакавіку 1917 г. для кіраўніцтва мясцовымі органамі ўлады. Аднак іх прававы статус, функцыянальныя абавязкі не былі дастаткова выразна акрэслены. У сувязі з чым шматлікія пытанні вырашаліся з дапамогай тлумачальных тэлеграм, цыркуляраў, інструкцый з боку МУС. Статус камісараў зацвердзіла пастанова Часовага ўрада «Об утверждении Временного положения о губернских (областных) и уездных комиссарах», апублікаваная 19 верасня 1917 г.

Аднак стварыць шырока разгалінаваную сістэму новых органаў аховы грамадскага парадку з аднолькавай структурай у перыяд Часовага ўрада так і не ўдалося. Як падкрэслівае вядомы расійскі даследчык гісторыі савецкай міліцыі прафесар Р. С. Мулукаеў, народная міліцыя не здолела цалкам замяніць царскую паліцыю і жандармерыю [14, с. 23]. Дарэчы, і сама міліцыя ў тагачасных афіцыйных дакументах называлася па-рознаму: міліцыя Часовага ўрада, народная міліцыя, грамадзянская міліцыя. Напрыклад, у заяве ў Мінскую гарадскую думу (кастрычнік 1917 г.) працаўнікі міліцыі пісалі: « ...мы, нижеподписавшиеся, работники Минской Городской Гражданской Милиции...» [12].

Днём заснавання беларускай міліцыі лічыцца 4 сакавіка. У гэты дзень у 1917 г. згодна з загадам грамадзянскага каменданта г. Мінска Б. Самойленкі на пасаду часовага начальніка міліцыі Усерасійскага Земскага Саюза па ахове парадку ў горадзе быў прызначаны служачы Усерасійскага Земскага Саюза Міхаіл Міхайлаў (пад гэтым прозвішчам хаваўся бальшавік Міхаіл Фрунзэ).

Грамадзянская міліцыя г. Мінска знаходзілася ў распараджэнні Выканаўчага Камітэта грамадскай бяспекі пры гарадскім камісары. На пасяджэннях гэтага Камітэта разглядаліся арганізацыя правапарадку ў горадзе, прашэнні аб залічэнні «на должность по милиции», зацвярджэнне яе кіраўнічага складу, а таксама розныя заявы грамадзян, у тым ліку і скаргі на дзейнасць міліцыі [1, с. 27].

Неабходна адзначыць, што арганізацыя і дзейнасць народнай міліцыі ажыццяўляліся ў гады Першай сусветнай вайны, калі на тэрыторыі Беларусі з 1915 г. ваенныя дзеянні фактычна не перапыняліся. Нямецкімі войскамі была акупіравана $^{1}/_{4}$ частка Беларусі, дзе жыло да вайны амаль 2 млн чалавек. Баявыя дзеянні і ўмовы ваеннага становішча выклікалі трагедыю агульнанацыянальнага маштабу – масавае ператварэнне мірнага насельніцтва ў бежанцаў. Дэмаграфічная сітуацыя значна пагоршылася і ў сувязі з мабілізацыяй. З Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губерняў у расійскую армію было забрана 633,6 тыс. чалавек, што складала больш за палову ўсіх працаздольных мужчын [24, с. 176]. Насельніцтва прыфрантавой паласы выконвала цяжкія ваенныя павіннасці (капанне акопаў, разгрузка эшалонаў, рамонт дарог, будаўніцтва мастоў і інш.), а таксама зазнала бясконцыя рэквізіцыі маёмасці, фуражу, прадуктаў харчавання дзеля патрэбаў арміі. Усё гэта абумовіла заняпад сельскай гаспадаркі, рост цэн на тавары першай неабходнасці і прадукты харчавання, значнае зніжэнне жыццёвага ўзроўню насельніцтва, абвастрэнне сацыяльнай напружанасці ў вёсцы, і як вынік – рэзкае абвастрэнне крымінагеннага становішча.

Тагачасная міліцыя Беларусі, як сведчаць дакументы, ахоўвала грамадскі парадак, вяла барацьбу са спекуляцыяй, кантралявала размеркаванне тавараў першай неабходнасці, займалася аховай грамадскай уласнасці, затрымлівала дэзерціраў і ўцекачоў з ліку ваеннапалонных, якія часцяком станавіліся ўдзельнікамі крадзяжоў і рабункаў.

Напрыклад, у ліпені 1917 г. начальнікам міліцыі Мінскай губерні было прадпісана «произвести в пределах вверенных им районов розыск» двух аўстрыйскіх ваеннапалонных уцекачоў і «в случае задержания уведомить начальника канцелярии при Главном начальнике Минского военного округа» [1, с. 28]. Начальнік Мазырскай павятовай міліцыі дакладваў на імя Мінскага губернскага камісара, што 21 красавіка 1917 г. узброеныя бандыты абрабавалі кватэру ўладальніка запалкавай фабрыкі «Молния» Айзенштата. Рабаўнікоў было сем, «пять из которых в солдатских шинелях с погонами» [1, с. 28 ].

Пасля перамогі 25 кастрычніка 1917 г. у Петраградзе ўзброенага паўстання рабочых і салдат пад кіраўніцтвам бальшавікоў – Кастрычніцкай рэвалюцыі на змену народнай міліцыі Часовага ўрада Расійскай рэспублікі прыходзіць савецкая рабоча-сялянская міліцыя Расійскай Сацыялістычнай Федэратыўнай Савецкай Рэспублікі (РСФСР).

У лістападзе 1917 г. у адпаведнасці з рашэннямі з’ездаў Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці, салдацкіх дэпутатаў армій Заходняга фронту і Саветаў сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў быў створаны вышэйшы орган улады на тэрыторыі Беларусі –

Абласны выканаўчы камітэт Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту (Аблвыкамзах) на чале з бальшавіком М. Рагазінскім. Міліцыя, сфарміраваная Часовым урадам, перайшла ў непасрэднае падначаленне аддзела ўнутраных спраў Аблвыкамзаха.

Прававаой асновай арганізацыі новай, савецкай, міліцыі стала пастанова Народнага камісарыята ўнутраных спраў (НКУС) Расійскай Савецкай Рэспублікі ад 28 кастрычніка (10 лістапада) 1917 г. «Аб рабочай міліцыі» , якая абвяшчала стварэнне міліцыі як выканаўчага органа мясцовых Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў.  Але ў гэтай сціслай пастанове (складалася з трох кароткіх пунктаў) не былі вызначаны канкрэтныя арганізацыйныя формы міліцэйскага апарату. У адпаведнасці з пастановай «Аб рабочай міліцыі» на месцах ствараліся ўзброеныя фарміраванні працоўных і пад іншымі назвамі: дружына аховы, атрады парадку і інш. [3, с. 12].

Асноўным прававым дакументам, які рэгламентаваў арганізацыю і дзейнасць савецкай міліцыі як штатнага дзяржаўнага органа аховы грамадскага парадку, стала Інструкцыя аб арганізацыі савецкай рабоча-сялянскай міліцыі, зацверджаная 12 кастрычніка 1918 г. народнымі камісарыятамі ўнутраных спраў і юстыцыі РСФСР. У згаданым дакуменце класавы характар міліцыі быў не толькі адлюстраваны ў назве «рабоча-сялянская», але і замацаваны ў яе асноўных задачах: «Советская милиция стоит на страже интересов рабочего класса и беднейшего крестьянства. Главной ее обязанностью является охрана революционного порядка и гражданской безопасности» [13, с. 54]. Інструкцыя таксама замацоўвала будаўніцтва міліцыі на аснове прынцыпу падвойнага падначалення: «Советская Рабоче-Крестьянская милиция является исполнительным органом Рабоче-Крестьянской Центральной власти на местах, состоящей в непосредственном ведении местных советов, и подчиняется общему руководству Народного Комиссариата по внутренним делам» [13, с. 52].

10 чэрвеня 1920 г. УЦВК і СНК РСФСР зацвердзілі першае Палажэнне аб рабоча-сялянскай міліцыі (абвешчана загадам  Галоўнага ўпраўлення савецкай рабоча-сялянскай міліцыі РСФСР ад 2 ліпеня 1920 г. № 4 [17]). Згодна з дадзеным Палажэннем, асноўнымі звёнамі адзінага апарату міліцыі з'яўляліся: а) гарадская і павятовая міліцыя (агульная міліцыя); б) прамысловая (фабрычна-заводская, лясная, горнапрамысловая і да т. п.); в) чыгуначная; г) водная (рачная і марская); д) вышуковая міліцыя. Усе органы агульнай, крымінальна-вышуковай і прамысловай міліцыі фарміраваліся паводле тэрытарыяльнага прынцыпу, а органы чыгуначнай і воднай міліцыі – згодна з лінейным прынцыпам. Як адзначаюць шматлікія расійскія даследчыкі гісторыі міліцыі, з выданнем Палажэння аб рабоча-сялянскай міліцыі (1920 г.) у асноўным завяршыўся працэс арганізацыйнага станаўлення савецкай міліцыі.

У адпаведнасці з вышэйпададзенымі дакументамі ствралася савецкая міліцыя ў Беларусі.

Вядомыя беларускія даследчыкі яе гісторыі А. Ф. Вішнеўскі і К. І. Барвінок адзначаюць, што напрыканцы 1918 г. у Заходняй вобласці  фарміраванне рабоча-сялянскай міліцыі ў асноўным завяршылася [3, с. 28; 13, с. 13].

Заходняя вобласць была ўтворана ў чэрвені 1917 г. як часовае аб'яднанне Мінскай, Віленскай і Магілёўскай губерняў (цэнтр – Мінск) з мэтай цэнтралізацыі кіраўніцтва мясцовымі Саветамі. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. у яе склад былі ўключаны тэрыторыі Віленскай, Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў. У 1918 г. у сувязі з акупацыяй большай часткі Беларусі нямецкімі войскамі (люты) цэнтр вобласці быў перанесены ў Смаленск, а ў склад Заходняй вобласці ўключана Смаленская губерня. У верасні 1918 г. яна была перайменавана ў Заходнюю камуну.

Але варта заўважыць, што на тэрыторыі Беларусі ў 1917–1920 гг. фактычна пачынаючы з Першай сусветнай вайны не сціхалі ваенныя дзеянні (германская інтэрвенцыя 1918 г., Польска-савецкая вайна 1919–1920 гг.). Адзначым таксама, што Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі 1917 г. «з'явіліся каталізатарамі працэсу самавызначэння Беларусі» [10, с. 331], галоўным вынікам якога стала ўтварэнне ў студзені 1919 г. Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі (ССРБ).

Пераход да мірнага будаўніцтва са стварэннем паўнавартаснай сістэмы бальшавіцкіх органаў улады і кіравання ў Беларусі пачаўся толькі ў 1920 г. пасля паспяховага наступу Чырвонай Арміі ў ліпені гэтага года на захад (9 ліпеня ад польскай акупацыі быў вызвалены Ігумен, 11 ліпеня – Мінск, 14 ліпеня – Вільня, 17 ліпеня – Ліда, 19 ліпеня – Гродна, 1 жніўня – Брэст [5, с. 421]). 31 ліпеня 1920 г. Ваенна-рэвалюцыйны камітэт ССРБ (Ваенрэўкам), які дзейнічаў у жніўні – снежні 1920 г. (старшыня – А. Чарвякоў) выдаў «Дэкларацыю аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі», адбылося другое абвяшчэнне ССРБ.

Рэспубліка аднаўлялася толькі ў складзе дзвюх няпоўных губерняў – Гродзенскай і Мінскай, беларускія раёны Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў заставаліся ў РСФСР [4, с. 111].

Таму відавочна, што арганізацыя міліцыі ў Беларусі ў 1917–1920 гг. мела непастаянны характар і адбывалася на тэрыторыях, часова занятых Чырвонай Арміяй і дзе часова ўсталёўвалася савецкая ўлада. Дарэчы, на гэты конт у першай кнізе па гісторыі беларускай міліцыі «Кароткі нарыс гісторыі міліцыі Беларусі (1917–1927)» адзначалася: «Акупацыі служылі тормазам, тым каменем, аб які разьбівалася ўся будаўнічая работа, якую трэба было кожны раз пачынаць нанава; практыкі ў рабоце не магло быць, а адсюль – слабасьць работы міліцыі, нізкая яе якасьць, асабовы склад не на сваім месцы» [8, с. 36].

Неабходна адзначыць і цікавы факт, дасюль не адлюстраваны ў айчыннай навуковай літаратуры: у час існавання ў лютым – ліпені 1919 г. Літоўска-Беларускай ССР (ЛітБел) міліцыя афіцыйна змяніла сваю назву. Падкрэслім, за ўсю гісторыю міліцыі Беларусі гэта адбылося толькі аднойчы і менавіта тады. У адпаведнасці з пастановай калегіі Камісарыята ўнутраных спраў ЛітБел (цыркуляр ад 22 сакавіка 1919 г. № 80) прапаноўвалася «впредь именовать милицию Рабоче-Крестьянской Охраной», а «слово Милиционер заменить словами дружинник Рабоче-Крестьянской Охраны» [6]. Дадзены цыркуляр быў адрасаваны ўсім органам мясцовай улады і міліцыі ЛітБел і падпісаны народным камісарам унутраных спраў і загадчыкам ужо новага органа – Галоўнага ўпраўлення рабоча-сялянскай аховы.

Аналіз архіўных дакументаў (у асноўным сканцэнтраваных у фондзе 35 вопісе 1 (Галоўнага ўпраўлення міліцыі і крымінальнага вышуку НКУС БССР) і фондзе 34 вопісе 1 (НКУС БССР) Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь) дазваляе зрабіць выснову, што арганізацыйна-штатная структура савецкай міліцыі ў Беларусі ўпершыню пачала выбудоўвацца ў 1921 г. У прыватнасці, аб гэтым сведчаць справаздачныя дакументы адносна дзейнасці міліцыі. Напрыклад, у дакладзе ў НКУС ССРБ (копія ў Галоўміліцыю РСФСР) аб дзейнасці міліцыі Беларусі з 1 лютага па 1 сакавіка 1921 г. адзначалася: «В феврале месяце деятельность Рабоче-Крестьянской милиции Белоруссии как и в предыдущие месяцы, в общем своем масштабе находилась и все еще находится в стадии организации» [7].

Трэба адзначыць, што першапачаткова НКУС Савецкай Беларусі быў створаны ў студзені 1919 г., але ў сакавіку таго ж года ў сувязі з утварэннем ЛітБел спыніў дзейнасць, а свае функцыі перадаў аддзелу Упраўлення міліцыі Мінскага губваенрэўкама і Народнаму камісарыяту ўнутраных спраў ЛітБел. НКУС ССРБ у 1920-х гг. займаўся пытаннямі савецкага будаўніцтва, аддзялення царквы ад дзяржавы і школы ад царквы, адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання, камунальнай гаспадаркі, рэгістрацыі прыватных таварыстваў і саюзаў, ажыццяўляў кіраўніцтва месцамі зняволення, у яго структуру ўваходзіла міліцыя і органы ЗАГС. У снежні 1930 г. НКУС БССР быў ліквідаваны, а яго функцыі перададзены іншым органам улады (ЦВК, Наркамюсту БССР і інш.). У 1934 г. быў утвораны НКУС БССР з новай структурай.

Асноўныя арганізацыйныя крокі па цэнтралізацыі міліцэйскага апарату Беларусі былі здзейснены на працягу жніўня – лістапада 1920 г.

13 жніўня 1920 г. кіраўніцтва Мінскай губміліцыі перайменавана ва Упраўленне рабоча-сялянскай міліцыі рэспублікі як складаючая частка НКУС РСФСР, з падпарадкаваннем па службовых пытаннях Галоўміліцыі РСФСР. У кастрычніку 1920 г., калі Мінская губерня была вызвалена ад польскіх акупацыйных войскаў, распараджэннем Ваенрэўкама Беларусі арганізоўваецца Галоўнае ўпраўленне рабоча-сялянскай міліцыі ССРБ пад кіраўніцтвам Станіслава Мертэнса.

З 2 верасня 1920 г. Галоўміліцыя знаходзілася ў падпарадкаванні Камісарыята ўнутраных спраў Ваенрэўкама Беларусі, які з 17 снежня 1920 г. па рашэнні II Усебеларускага з'езда Саветаў быў пераўтвораны ў Народны камісарыят унутраных спраў ССРБ. Галоўміліцыя ССРБ з'яўлялася самастойнай структурнай адзінкай НКУС ССРБ. Начальнік Галоўміліцыі з'яўляўся членам калегіі НКУС і прызначаўся Прэзідыумам ЦВК ССРБ па прадстаўленні калегіі НКУС, а начальнікі аддзелаў Галоўміліцыі прызначаліся і звальняліся НКУС па прадстаўленні начальніка Галоўміліцыі [20].

Структура Галоўміліцыі прадугледжвала арганізацыю наступных аддзелаў: следча-вышуковай міліцыі (Галоўвышук), павятова-гарадской (агульнай) міліцыі, прамысловай міліцыі, інспектарскага, матэрыяльнага і сакратарыята [21]. Непасрэдная барацьба са злачыннасцю (вышук і затрыманне злачынцаў) канцэнтравалася ў аддзеле следча-вышуковай міліцыі (Галоўвышук).

Загадам Галоўміліцыі ад 2 снежня 1920 г. № 21 была абвешчана першая аргштатная структура Галоўнага ўпраўлення (аддзелы агульны, інспектарскі, матэрыяльны, Галоўвышук, прамысловай міліцыі, палітаддзел і сакратарыят), Мінскай гарадской і павятова-гарадской савецкай рабоча-сялянскай міліцыі Беларусі, зацверджаная НКУС ССРБ на пасяджэнні 21 лістапада 1920 г. [16].

У далейшым структура міліцыі Беларусі зведала наступныя істотныя змены. У 1922 г. згодна з загадам НКУС БССР з падпарадкавання міліцыі вывелі крымінальны вышук. У цэнтры створана Упраўленне крымінальнага вышуку, якое было непасрэдна падначалена Наркаму ўнутраных спраў. У 1924 г. Упраўленне крымінальнага вышуку было ліквідавана, а яго функцыі перададзены Галоўміліцыі БССР, якую перайменавалі ва Упраўленне міліцыі і крымінальнага вышуку НКУС БССР, у 1927–1930 гг. – у Адміністратыўнае ўпраўленне НКУС БССР, у 1930–1934 гг. – у Галоўнае ўпраўленне міліцыі і крымінальнага вышуку пры СНК БССР.

10 ліпеня 1934 г. пастановай ЦВК СССР на базе Аб'яднанага Дзяржаўнага палітычнага ўпраўлення СССР быў створаны НКУС СССР [11, с. 12]. Адпаведныя змены адбыліся і ў Беларусі, дзе на ўзор саюзнага ў 1934 г. на базе ДПУ БССР быў створаны рэспубліканскі наркамат унутраных спраў, у структуру якога ўваходзіла Упраўленне рабоча-сялянскай міліцыі. На раённым узроўні адзіным апаратам, які выконваў задачы органаў НКУС, было райаддзяленне (РА) НКУС. Начальнік аддзялення міліцыі РА НКУС БССР адначасова з'яўляўся памочнікам начальніка РА па міліцыі [19]. У рамках разгледжанага перыяду (1917–1939) міліцыя надалей заставалася структурнай адзінкай НКУС.

Адметнай рысай арганізацыйна-структурнай пабудовы міліцыі стала наяўнасць у яе штаце спецыяльных падраздзяленняў, якія займаліся палітыка-выхаваўчай работай. У 1921 г. у структуры Галоўміліцыі Беларусі быў створаны палітсакратарыят, у абавязкі якога ўваходзіла «наблюдение за политическим состоянием и политработой в органах милиции» [3, с. 108].

Адметнай рысай арганізацыі і дзейнасці міліцыі ў 1920-х гг. таксама стала яе ваенізацыя – арганізацыя міліцыі паводле прынцыпу Чырвонай Арміі і звядзенне ўзброеных сіл міліцыі ў вайсковыя часці. Як адзначалася ў Інструкцыі «О проведении в жизнь организации милиции в губерниях на основах Красной армии», абвешчанай у загадзе па Галоўнаму ўпраўленню савецкай рабоча-сялянскай міліцыі РСФСР ад 15 кастрычніка 1920 г. № 10: «Целью такой организации является создание из Милиции боевых единиц, которые могут быть в нужный момент сконцентрированы в любой части губернии и допользованы путем переброски для усиления охраны, ликвидации выступлений бандитских шаек и т. д.» [18].

У першую чаргу згаданая рэарганізацыя была абумоўлена складаным унутрыпалітычным становішчам, якое характарызавалася дужа высокім напачатку 1920-х гг. узроўнем бандытызму ў РСФСР, а таксама ў Беларусі і Украіне. Барацьба з бандытызмам з'яўлялася адным з самых галоўных кірункаў аператыўна-службовай дзейнасці міліцыі і крымінальнага вышуку ў першай палове 1920-х гг.

Пераход да мірнага будаўніцтва і на рэйкі новай эканамічнай палітыкі – нэпа (абвешчана ў сакавіку 1921 г. X з'ездам РКП(б)), адметнымі рысамі якой сталі ўвядзенне харчпадатку, свабода гандлю, развіццё сельскагаспадарчай кааперацыі і дробнай прыватнай уласнасці, скарачэнне адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў, паставіў і новыя задачы перад міліцыяй. Міліцыя павінна была садзейнічаць агентам Наркамхарча (Народнага камісарыята харчавання) у збіранні падаткаў, рэгістраваць гандлёвыя прадпрыемствы і патэнты, весці барацьбу з самагонаварэннем (таемным браварніцтвам). Агульна, на міліцыю, акрамя непасрэднай задачы па ахове грамадскага парадку і барацьбе са злачыннасцю, паводле Палажэння аб НКУС БССР (1924 г.) ускладалася «правядзенне ў жыццё пастаноў і распараджэнняў цэнтральнай і мясцовай улады», а таксама «садзейнічанне органам усіх ведамстваў пры правядзенні апошнімі ў жыццё ўскладзеных на іх заданняў» [15].

У гады нэпа адзначыўся рост злачынстваў, накіраваных супраць фінансавай і эканамічнай асновы Савецкай дзяржавы. Асноўным напрамкам дзейнасці міліцыі Беларусі ў гэты перыяд з'яўлялася барацьба з маёмаснымі, службовымі і контррэвалюцыйнымі злачынствамі, а таксама са злачынствамі, накіраванымі супраць парадку дзяржаўнага кіравання.

Важным кірункам дзейнасці міліцыі па ахове грамадскага парадку і барацьбе са злачыннасцю ў 1920-я гг. таксама была: барацьба з канакрадствам (у працэнтных адносінах сярод маёмасных злачынстваў дасягалі 42 % [3, с. 150]), ляснымі правапарушэннямі, хуліганствам – найбольш распаўсюджаным з усіх відаў злачынстваў, якія парушаюць грамадскі парадак. У сферу

аператыўна-службовай дзейнасці міліцыі ўваходзіла і барацьба з прастытуцыяй, якая развілася ў часы нэпа. Рэспубліканская газета «Звезда» пісала ў 1922 г.: «В Наркомвнуделе поднят вопрос о борьбе с развившейся в Минске проституцией. Из доклада Начглавмилиции т. Кроля выяснилось, что в городе обнаружено до 50 притонов» [2].

Паводле Палажэння аб рабоча-сялянскай міліцыі і крымінальным вышуку БССР (1930 г.) міліцыя азначалася як адміністрацыйна-ваенізаваны орган савецкай улады, што па сутнасці з'яўлялася характарыстыкай усёй яе папярэдняй дзейнасці. Міліцыя не толькі змагалася з крымінальнай злачыннасцю, але і ўдзельнічала ва ўзброенай барацьбе з унутранай і знешняй контррэвалюцыяй, садзейнічала ўкараненню сацыялістычных метадаў вядзення гаспадаркі, аказвала адміністрацыйнае садзейнічанне мясцовым органам улады. Іншымі словамі, яе дзейнасць была падпарадкавана агульным задачам сацыялістычнага будаўніцтва. Варта таксама адзначыць, што міліцыя ў сваёй дзейнасці кіравалася крымінальнымі кодэксамі (КК), у якіх быў замацаваны класавы характар савецкай крымінальнай палітыкі. Напрыклад, арт. 4 КК БССР 1928 г. вызначаў наступнае паняцце злачынства: «Грамадаска небяспечным дзеяннем (злачынствам) прызнаецца ўсякае дзеянне або бяздзеянне, накіраваныя супраць асноў савецкага ладу або правапарадку, устаноўленых рабоча-сялянскай уладай на пераходны да камунізму перыяд» [9, с. 270].

Пачынаючы з 1934 г. міліцыя з'яўлялася складаючай часткай новага (з новай структурай і функцыямі), у адрозненне ад 1920-х гг., наркамата ўнутраных спраў, у кампетэнцыю якога ўваходзіла дзяржаўная бяспека, грамадскі парадак, пагранічная і ўнутраная ахова.

Такім чынам, дзейнасць міліцыі Беларусі ў 1917–1934 гг. была падпарадкавана агульным задачам сацыялістычнага будаўніцтва і вызначалася шырокім колам задач, асноўнымі з якіх былі ахова правапарадку і барацьба з бандытызмам. Непасрэдны ўплыў на дзейнасць міліцыі Беларусі аказала фарміраванне штатнай цэнтралізаванай структуры, якое пачалося з 1921 г.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Белорусский уголовный розыск / авт.-сост. Ю. В. Курьянович. – Минск : Бонем, 2003. – 600 с.

2. Борьба с проституцией // Звезда. – 1922. – 5 апр. – С. 4.

3. Вишневский, А. Ф. Организация и деятельность милиции Беларуси. 1917–1940 гг.: историко-правовые аспекты / А. Ф. Вишневский. – Минск : Тесей, 2000. – 224 с.

4. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2000–2007. – Т. 5 : Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – 2007. – 613 с.

5. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. Кн. 1 / А. А. Каваленя [і інш.] ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 584 с.

6. Декрет СНК Советской республики Литвы и Белоруссии о правах и льготах добровольцев, постановления, приказы и циркуляры Комиссарита государственного контроля БССР. 22 февраля – 9 августа 1919 г. // Дзярж. архіў Мін. вобл. – Ф. 294. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк. 41.

7. Доклады начальников отделов Главмилиции БССР о работе за декабрь 1920 г. – сентябрь 1921 г. // Нац. архіў Рэсп. Беларусь. – Ф. 35. – Воп. 1. – Спр. 16. – Арк. 39.

8. Кароткі нарыс гісторыі міліцыі Беларусі. 1917–1927 / І. Крэйнін [і інш.] ; пад агул. рэд. А. Сташэўскага. – Менск, 1927.

9. Крымінальнае права Беларусі (закон, злачынства, адказнасць) : навуч. дапам. / А. У. Баркоў [і інш.] ; пад рэд. А. У. Баркова. – Мінск : Завігар, 1997. – 288 с.

10. Ладысеў, У. Спробы самавызначэння Беларусі пасля ўстанаўлення савецкай улады ў краі / У. Ладысеў // Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. Кн. 1 / А. А. Каваленя [і інш.] ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – С. 331–337.

11. Лубянка. ВЧК – ОГПУ – НКВД – НКГБ – МГБ – МВД – КГБ. 1917 – 1960 : справочник / сост.: А. И. Кокурин, Н. В. Петров ; науч. ред. Р. Г. Пихоя. – М. : Междунар. фонд «Демократия», 1997. – 352 с.

12. Материалы о М. В. Фрунзе (1917–1925 годы) // Нац. архіў Рэсп. Беларусь. – Ф. 60п. – Воп. 3. – Спр. 547. – Арк. 3.

13. Милиция Беларуси. Документы и материалы (1917–2007) / сост. К. И. Барвинок [и др.] ; под ред. К. И. Барвинка, А. Ф. Вишневского. – Минск : Акад. МВД Респ. Беларусь, 2007. – 352 с.

14. Мулукаев, Р. С. Организационно-правовые основы становления советской милиции (1917–1920 гг.) : учеб. пособие / Р. С. Мулукаев. – М. : Акад. МВД СССР, 1975.

15. Положение о Народном Комиссариате Внутренних Дел БССР // Собр. узаконений и распоряжений рабоче-крестьян. правительства БССР. – 1924. – № 25–26. – Ст. 221.

16. Приказы Главмилиции БССР, штатные расписания Главмилиции БССР, Минской городской и уездной милиции. 25 октября – 31 декабря 1920 г. // Нац. архіў Рэсп. Беларусь. – Ф. 35. – Воп. 1. – Спр. 24. – Арк. 63, 63ад.

17. Приказы Главного управления рабоче-крестьянской милиции РСФСР. 9 июня – 15 декабря 1920 г. // Нац. архіў Рэсп. Беларусь. – Ф. 35. – Воп. 1. – Спр. 5. – Арк. 6.

18. Приказы Главного управления рабоче-крестьянской милиции РСФСР. 9 июня – 15 декабря 1920 г. // Нац. архіў Рэсп. Беларусь. – Ф. 35. – Воп. 1. – Спр. 5. – Арк. 30адв.

19. Приказы. 1934 г. // Архіў М-ва ўнутр. спраў Рэсп. Беларусь. – Ф. 50. – Воп. 4. – Спр. 4. – Арк. 29.

20. Проект положения о промышленной милиции, приказы и штатные расписания Главмилиции БССР и Минской городской милиции. 9 августа – 13 декабря 1920 г. // Нац. архіў Рэсп. Беларусь. – Ф. 35. – Воп. 1. – Спр. 33. – Арк. 13адв.

21. Проект положения о промышленной милиции, приказы и штатные расписания Главмилиции БССР и Минской городской милиции. 9 августа – 13 декабря 1920 г. // Нац. архіў Рэсп. Беларусь. – Ф. 35. – Воп. 1. – Спр. 33. – Арк. 13.

22. Сборник Указов и Постановлений Временного правительства. Выпуск № 2. 5 мая – 24 июля 1917 г. / Составлен Управлением Кодификационною Частью. – Петроград : Первая Гос. Тип., 1918.

23. Сборник Указов и Постановлений Временного правительства. Выпуск № 1. 27 февраля – 5 мая 1917 г. / Составлен Отделением Свода Законов Государственной Канцелярии. – Петроград : Гос. тип., 1917.

24. Шыбека, З. Нарыс гісторыі Беларусі (1795 – 2002) / З. Шыбека. – Мінск : Энцыклапедыкс, 2003. – 490 с.

25. Ярославский губернский комиссар Временного Правительства [Электронный ресурс] // Государственный архив Ярославской области. – 2010. – Режим доступа: http://www.yararchive.ru/funds/fund81687/. – Дата доступа: 10.04.2013.

Дата паступлення ў рэдакцыю: 16.05.2022

УДК 351.741

***А. И. Мурашко***, *кандидат исторических наук, доцент,*
*заместитель начальника кафедры теории и истории государства и права*
*Академии Министерства внутренних дел Республики Беларусь*
*e-mail: mourashko77@mail.ru*

## КАДРОВОЕ ОБЕСПЕЧЕНИЕ ПОДРАЗДЕЛЕНИЙ МВД – МООП – МВД БССР В 1953–1968 гг.: ИСТОРИОГРАФИЧЕСКИЙ АСПЕКТ

*Рассматривается историографический аспект научной проблематики, связанной с кадровым обеспечением органов внутренних дел БССР в период реформ советской правоохранительной системы 1953–1968 гг. На основе анализа историографии автор приходит к выводу, что заявленная тематика получила определенное фрагментарное освещение в научных трудах белорусских ученых. В целом в отечественной историографии отсутствуют комплексные исследования, посвященные кадровому обеспечению органов внутренних дел БССР в заявленный исторический период.*

*Ключевые слова: органы внутренних дел, милиция, министерство внутренних дел, министерство охраны общественного порядка, историография.*

***A. I. Murashko***, *Candidate of Historical Sciences, Associate Professor,*
*Deputy Head of the Department of Theory and History of State and Law*
*of the Academy of the Ministry of Internal Affairs of the Republic of Belarus*
*e-mail: mourashko77@mail.ru*

## STAFFING OF THE DIVISIONS OF THE MIA – MOOP – MIA BSSR IN 1953–1968: HISTORIOGRAPHICAL ASPECT

*The article deals with the historiographical aspect of scientific issues related to the staffing of the internal affairs bodies of the BSSR in a rather difficult period of reforms in the Soviet law enforcement system in 1953–1968. Based on the analysis of historiography, the author comes to the conclusion that the declared subject matter has received a certain fragmentary coverage in the scientific works of Belarusian scientists. More attention of scientists was devoted*